# ПАСЛЯ ЧАРНОБЫЛЯ

## Як Беларусь пераадольвае наступствы аварыі на ЧАЭС

**Аварыя на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі — самая маштабная тэхнагенная катастрофа ў гісторыі чалавецтва. Яе наступствы адчулі больш за 20 краін свету, але галоўны ўдар прыняла на сябе беларуская зямля. Радыеактыўнае забруджванне закранула ўсю тэрыторыю рэспублікі (у першую чаргу — Гомельскую, Магілёўскую і Брэсцкую вобласці), але асабліва пацярпелі 3678 гарадоў, пасёлкаў і вёсак, дзе пражывала больш за два мільёны чалавек. 479 населеных пунктаў тады спынілі сваё існаванне, а плошча зоны адчужэння склала 1,7 тыс. квадратных кіламетраў.**

Рэха чарнобыльскай трагедыі Беларусь адчувае да гэтага часу. Але час загойвае нават такія раны. Ідзе паступовы вывад населеных пунктаў з зоны радыеактыўнага забруджвання ў сувязі з паляпшэннем радыяцыйнага становішча, працягваецца сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых тэрыторый. Пра тое, што зроблена і робіцца сёння ў нашай краіне для пераадолення наступстваў самай маштабнай аварыі ў гісторыі атамнай энергетыкі, напярэдадні 38-й гадавіны трагедыі расказалі прадстаўнікі Дзяржатамнагляду.

### Бяспека — найважнейшая задача

— Наступствы катастрофы на ЧАЭС носяць глабальны характар, — падкрэсліў **першы намеснік начальніка Дзяржатамнагляду Леанід ДЗЯДУЛЬ.** — У выніку выбухаў і пажараў у атмасферу было выкінута каля 200 відаў радыенуклідаў з перыядам паўраспаду ад некалькіх гадзін да соцень тысяч гадоў.

Асноўны ўдар прыпаў на тэрыторыю Беларусі, адзначыў ён. У якасці прыкладу вучоны прывёў радыенуклід цэзій-137. «Ён уносіць асноўны ўклад, каля 90 %, у фарміраванне дозавай нагрузкі на насельніцтва», — растлумачыў спецыяліст. 35 % ад агульнага аб'ёму гэтага радыенукліду на еўрапейскай тэрыторыі выпала на Беларусь.

— За пасляаварыйны перыяд плошча радыеактыўнага забруджвання па цэзію-137 з прычыны яго распаду паменшылася амаль у два разы. Калі быць дакладным, у 1,8 раза, — расказаў прадстаўнік Дзяржатамнагляду. — І цяпер складае каля 25,5 тыс. квадратных кіламетраў, або 12 % агульнай плошчы тэрыторыі Рэспублікі Беларусь.

Застаюцца забруджанымі звыш 1 кюры на квадратны кіламетр па цэзію-137 каля паўтара млн гектараў лясоў і каля 819 тыс. гектараў сельгасугоддзяў. Па стане на 2024 год у зонах радыеактыўнага забруджвання размешчана больш за дзве тысячы населеных пунктаў, у якіх пражывае каля 930 тысяч чалавек, 185 тысяч з якіх — дзеці. Тэрыторыі размешчаны ў Гомельскай, Магілёўскай, Мінскай, Гродзенскай і Брэсцкай абласцях.

— Карэкціроўка пераліку праводзіцца кожныя пяць гадоў. На працягу 2024—2025 гадоў работа па радыеэкалагічным абследаванні гэтых населеных пунктаў будзе завершана, і ў пачатку 2026 года пералік будзе адкарэкціраваны з прыняццем адпаведнай пастановы ўрада, — удакладніў Леанід Дзядуль.

Работа вядзецца ў рамках рэалізацыі Дзяржаўнай праграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС на 2021—2025 гады.

— Гэта ўжо шостая праграма, яна накіравана на далейшае развіццё пацярпелых тэрыторый, вырашэнне пытанняў у сацыяльнай сферы і задач у галіне забеспячэння радыяцыйнай бяспекі.

Шэраг задач па чарнобыльскай праблематыцы рэалізоўваецца сумесна з Расійскай Федэрацыяй у рамках саюзных праграм, расказаў прадстаўнік Дзяржатамнагляду.

— Пастаянным камітэтам Саюзнай дзяржавы адобраны сумесныя прапановы па распрацоўцы Саюзнай праграмы на 2025—2029 гады, і сёлета плануем унесці праграму на зацвярджэнне ўрада, — дадаў навуковец. — Таксама плануюцца мерапрыемствы да 40-й гадавіны



з дня трагедыі на Чарнобыльскай атамнай станцыі.

У цэлым, з 1986 года на пераадоленне наступстваў аварыі дзяржавай было накіравана каля 20 млрд долараў, паведаміў Леанід Дзядуль. Рэалізавана пяць дзяржаўных і пяць саюзных праграм. Дзякуючы гэтаму сёння ўжо можна весці размову не аб рэабілітацыі, а менавіта аб адраджэнні пацярпелых рэгіёнаў.

— Пры гэтым задачы па забеспячэнні радыяцыйнай бяспекі насельніцтва, якое пражывае на забруджаных тэрыторыях, па-ранейшаму актуальныя. Гэта тэматыка была ініцыіравана намі і ўключана ў зацверджаныя ў мінулым годзе ўрадам нашай краіны «Асноўныя кірункі палітыкі ў галіне забеспячэння ядзерна-радыяцыйнай бяспекі і стратэгіі абыходжання з радыеактыўнымі адходамі», — сказаў першы намеснік начальніка Дзяржатамнагляду.

### Ядзерная спадчына

Сёння ў Беларусі акцэнт у чарнобыльскай праблематыцы робіцца на забеспячэнне радыяцыйнай бяспекі, адзначыў **начальнік упраўлення па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі і аб'ектамі ядзернай спадчыны Дзяржатамнагляду Дзмітрый ПАЎЛАЎ.**

— Гэта ў першую чаргу бяспека для насельніцтва, бяспека прадукцыі, якая вырабляецца на гэтых тэрыторыях, а таксама бяспека саміх гэтых тэрыторый, — адзначыў вучоны. — У Дзяржпраграму ўключаны цэлы раздзел, накіраваны на вырашэнне такіх праблем, як рэалізацыя комплексу ахоўных мер у сельгасвытворчасці для атрымання нарматыўна-чыстай прадукцыі, правядзенне мерапрыемстваў у лясной гаспадарцы па рацыянальным выкарыстанні лесу на забруджаных тэрыторыях. Ёсць у нас і вялікі пласт тэрыторый, дзе вядзецца кантрольна-прапускны рэжым: яны выведзены з карыстання.

У мінулым годзе ўпершыню ў нашай краіне, кіруючыся падыходамі МАГАТЭ, быў уведзены тэрмін «аб'екты ядзернай спадчыны», расказаў Дзмітрый Паўлаў.

— Да гэтых аб'ектаў належыць, у прыватнасці, Палескі радыяцыйна-экалагічны запаведнік. Такія аб'екты маюць пяць раёнаў Магілёўскай вобласці і восем раёнаў Гомельскай вобласці. Гэта ў тым ліку радыяцыйна небяспечныя землі, якія выведзены з сельгасабароту. Для іх распрацаваны асобныя алгарытм, — патлумачыў ён.

Калі ж весці размову аб тых землях, дзе вырошчваецца ўраджай, тут намаганні накіраваны на атрыманне нарматыўна-чыстай прадукцыі, паведаміў ён.

— Нормы ў Рэспубліцы Беларусь у разы больш жорсткія, чым агульнаеўрапейскія. Калі ў малацэ па цэзію-137 згодна з сусветнымі нормамі дапускаецца да 1000 бекерэляў на кілаграм, то ў Беларусі гэтая норма — 50, у 20 разоў больш жорсткая. Такі падыход дае магчымасць не дапускаць павышэння дозавай нагрузкі на насельніцтва, — звярнуў увагу прадстаўнік Дзяржатамнагляду.

Для аздараўлення зямель і немагчымасці пераходу радыенуклідаў з глебы ў сельгаспрадукцыю, з 2021 да 2023 года ўнесена каля 230 тыс. тон угнаенняў, праванавана 58 тыс. га кіслых глеб, расказаў спецыяліст:

— У гэты комплекс таксама ўваходзяць аграхімічныя мерапрыемствы, падбор у севазвароце відаў і сартоў культур з улікам іх здольнасці да назапашвання радыенуклідаў. Меліярацыйныя мерапрыемствы накіраваны на нармалізацыю воднага балансу пацярпелых зямель. Праводзіцца і шэраг іншых спецыяльных мер. У выніку гарантавана атрымліваецца чыстая прадукцыя.

За мінулыя гады ў краіне сфарміравана сістэма кантролю радыеактыўнага забруджвання, падкрэсліў Дзмітрый Паўлаў, і яна працуе на ўсіх узроўнях.

— У гэтай частцы мы максімальна абароненыя, — рэзюмаваў ён.

Унікальны аб'ект спадчыны трагедыі на ЧАЭС — Палескі запаведнік — быў створаны з мэтай прадухілення распаўсюджвання радыенуклідаў, распавёў Дзмітрый Паўлаў.

— Цяпер гэта вельмі цікавая тэрыторыя. Зняцце антрапагеннай нагрузкі паўплывала на яе, і сёння тут ажыццяўляюцца эксперыментальныя віды дзейнасці, праводзяцца розныя даследаванні. У той жа час гэтая ўнікальная тэрыторыя ў сувязі з забруджваннем патрабуе стварэння бяспекі. Унесены змяненні ў заканадаўства аб ліцэнзаванні: усе віды дзейнасці, якія будуць ажыццяўляцца ў запаведніку, цяпер падлягаюць ацэнцы бяспекі. Толькі пасля таго, як пераканаемся, што гэтая дзейнасць не паўплывае на здароўе людзей і не стане крыніцай забруджанай прадукцыі, пацвердзім выдачай ліцэнзіі. Да 1 чэрвеня запаведнік павінен яе атрымаць.

Дзейнасць Дзяржатамнагляду, накіраваная на бяспеку, ажыццяўляецца ў прамым кантакце з мясцовымі органамі ўлады і спецыялістамі на месцах, дадаў начальнік упраўлення Дзяржатамнагляду.

### У будучыню — з надзеяй

— Дзяржатамнагляд выступае заказчыкам мерапрыемстваў па інфармаванні насельніцтва пацярпелых тэрыторый, — адзначыла **начальнік упраўлення кадравай, ідэалагічнай, арганізацыйна-аналітычнай работы і менеджменту якасці Дзяржатамнагляду Таццяна БАСЕНКА.** — Гэта абавязковая ўмова фарміравання адэкватнага ўспрымання постчарнобыльскай сітуацыі, зніжэння псіхалагічнай напружанасці.

Для розных катэгорый насельніцтва праводзяцца такія мерапрыемствы: семінары і практыкумы для спецыялістаў сельгасарганізацый і прадстаўнікоў фермерскіх гаспадарак, распаўсюджванне тэматычных матэрыялаў па радыяцыйнай бяспецы, у тым ліку для школьнікаў.

— Хачу таксама згадаць традыцыйную штогадовую сацыяльна-творчую праграму «У будучыню — з надзеяй», накіраваную на падтрыманне таленавітай моладзі, якая пражывае на пацярпелых тэрыторыях, — сказала спецыяліст.

Забяспечваецца і навукова-тэхнічная падтрымка, падкрэсліла яна: вынікі даследаванняў даюць магчымасць прымаць навуковаабгрунтаваныя рашэнні для мінімізацыі наступстваў катастрофы. Даследаванні звязаны з медыцынскімі праблемамі і задачамі ў галіне радыяцыйнай аховы насельніцтва, адрасным прымяненнем ахоўных мер у сельскай і лясной гаспадарцы, атрыманнем бяспечнай харчовай прадукцыі.

— Асаблівая ўвага — сацыяльным пытанням, — працягнула Таццяна Басенка. — На пацярпелых тэрыторыях арганізавана бясплатнае харчаванне 180 тыс. навучэнцаў. Колькасць дзяцей, якія прайшлі санітарна-курортнае лячэнне, склала больш за 250 тыс. чалавек. Мерапрыемствамі дзяржпраграмы прадугледжаны будаўніцтва, рэканструкцыя, мадэрнізацыя аб'ектаў жыллёвага фонду, сельскай гаспадаркі, адукацыі і аховы здароўя. Усяго на сацыяльна-эканамічнае развіццё пацярпелых рэгіёнаў за тры гады накіравана каля 330 млн рублёў.

### Каб трагедыя не паўтарылася

У сферы ядзернай бяспекі важнае міжнароднае супрацоўніцтва — на гэта асабліва звярнуў увагу Леанід Дзядуль:

— У рамках распрацоўкі і ўдасканалення заканадаўства ў галіне ядзернай і радыяцыйнай бяспекі мы ўлічваем міжнародны вопыт, рэкамендацыі МАГАТЭ. Супрацоўніцтва ішло падчас будаўніцтва Беларускай атамнай электрастанцыі. Гэтыя падыходы намі транслююцца і пры вырашэнні пытанняў забеспячэння радыяцыйнай бяспекі на тэрыторыі, якая пацярпела ад аварыі на ЧАЭС.

Кожныя тры гады Беларусь абараняе нацыянальныя даклады па Канвенцыі ядзернай бяспекі, Аб'яднанай канвенцыі па абыходжанні з радыеактыўнымі адходамі і адпрацаваным ядзерным палівам, расказаў Леанід Дзядуль.

— Зразумела, як важна супрацоўніцтва з суседнімі дзяржавамі, — адзначыў ён. — Апошнім часам ёсць пэўныя абмежаванні з улікам падзей, якія адбываюцца, па ўзаемным абмене інфармацыяй з украінскім бокам, хоць мы адкрытыя для дыялогу гэтак жа, як і з літоўскім бокам. Польшча планує будаўніцтва атамнай электрастанцыі, і цяпер рыхтуюцца дакументы, якія абгрунтоўваюць бяспеку ў рамках Канвенцыі Эспа (аб ацэнцы ўздзеяння на навакольнае асяроддзе ў трансгранічным кантэксце). Як суседняя дзяржава, Польшча прадстаўляе нам дакументы, і мы маем права задаць пытанні і атрымаць на іх адказы, нешта ўдакладніць. Работа ў гэтай сферы ідзе і, спадзяёмся, будзе працягвацца.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**